ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 5 (867) | Аўторак, 22 сакавіка 1994 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## АТРЫМАЎ ДЫПЛОМ АКАДЭМІКА

Летась была створана Міжнародная акадэмія навук вышэйшай школы. Гэта новая самакіруемая небюджэтная арганізацыя. Яе мэта -- садзейнічанне навуцы ў ВНУ і падтрымка на неўрадавым узроўні імкнення вучоных вышэйшай школы розных краін да аб'яднання намаганняў.

Адбыліся выбары ў новую навуковую ўстанову. Акадэмікам МАН абраны і рэктар нашага універсітэта прафесар Л.А.Шамяткоў. Нядаўна ён атрымаў дыплом Міжнароднай акадэміі.

♦ ♦ ♦

## З ВУЧОНЫМ ЗВАННЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты горача віншуюць з прысваеннем 4 сакавіка г.г. Атэстацыйнай калегіяй Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнт: УЛАСАВУ Аляксандру Васільевічу — па кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ; ІОФЕ Льву Аркадзьевічу — па кафедры ЭІ і АСК; ШУЛЬЗЕ Сяргею Рыгоравічу, АНДРЭЕВУ Віктару Васільевічу — па кафедры тэарэтычнай фізікі; РОГАЛЕВУ Аляксандру Фёдаравічу — па кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства; КРАЎЦОВАЙ Валерыі Іванаўне — па кафедры філасофіі.

## ДА ЎРАЧЫСТАСЦЕЙ -- 50 ДЗЁН

Два дні -- 12 і 13 мая -- у нашым універсітэце будуць праходзіць урачыстасці, прысвечаныя яго 25-гадоваму юбілею. Да знамянальнай даты засталося зусім мала часу. А зрабіць яшчэ патрэбна шмат як у цэлым па ГДУ, так і на факультэтах, у іншых структурных падраздзяленнях. Справіцца з шырокай праграмай можна толькі агульнымі намаганнямі пры высокай зацікаўленасці і актыўнасці большасці членаў шматтысячнага універсітэцкага калектыву. Менавіта аб гэтым і ішла размова на чарговым пасяджэнні аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенню юбілею універсітэта, якое вёў першы прарэктар прафесар М.В.Селькін.

*Працоўнае лета -- не за гарамі*

## ПАД СТУК КОЛАЎ

На двары вясна, а некаторыя юнакі і дзяўчаты нашага універсітэта жывуць ужо летнімі клопатамі. А звязаны яны з работай у студэнцкіх атрадах на час трэцяга працоўнага семестра.

Сёлета з 60-ці чалавек розных факультэтаў і курсаў сфарміраваны атрад праваднікоў чыгуначных паяздоў. 30 юнакоў і дзяўчат будуць працаваць на маршруце Гомель-Масква, столькі ж возьмуць на сябе абавязкі па абслугоўванню пасажыраў паяздоў, якія курсіруюць у паўднёвым накірунку -- у Адэсу.

На мінулым тыдні пачалася вучоба будучых праваднікоў, у час якой яны атрымаюць усе неабходныя веды для выканання сваіх абавязкаў у час летніх рэйсаў.

## ЮБІЛЕЙ ІНСТЫТУТА

Споўнілася 50 гадоў з дня адкрыцця Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай. Урачыстасць, прысвечаная гэтай падзеі, адбылася 15 сакавіка. Юбілярам было выказана шмат цёплых слоў, уручаны памятныя адрасы, у тым ліку і ад нашага універсітэта. Асабісты памятны адрас уручаны і ад імя Героя Сацыялістычнай Працы, прафесара кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ доктара педагагічных навук М.А.Дзмітрыева, які на працягу 10 гадоў быў рэктарам названай вышэйшай навучальнай установы.

## ВЫЖЫВАЕМ...

Нас ужо цяжка здзівіць новымі цэннікамі па таварах у магазінах, на якіх нулі прыбаўляюцца з упартым пастаянствам. А грашовыя дабаўкі да нашых зарплат, стыпендый, розных дапамог далёка неадэкватныя той суме, якая цяпер неабходна для больш-менш нармальнага жыцця.

Вось і гэта вясна прынесла нам разам з цяплом і ласкавым сонейкам і навіну менш прыемную: зноў павысіліся рознічныя цэны на асобныя жыццёва важныя тавары і тарыфы на паслугі. У сувязі з гэтым Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову аб павышэнні з 1 красавіка мінімальнай заработнай платы з 30 да 60 тысяч рублёў, а тарыфная стаўка I разрада цяпер будзе складаць 65 тыс. руб. У два разы павялічваюцца памеры стыпендый студэнтам.

Цяпер кашалькі ў нас папоўняцца дадатковай масай грашовых купюр, толькі вось, на жаль, ненапоўненымі хаця б самымі неабходнымі прадуктамі харчавання акажуцца нашы спажывецкія кошыкі.

Выжываем? Выжываем...

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● 4-5, 7-8 *Для вас, абітурыенты-94.* /Усё аб уступных экзаменах для паступаючых на дзённае аддзяленне і завочны факультэт ГДУ імя Ф.Скарыны/.

● 2 Жыццё універсітэта: навіны, інфармацыя.

● 3 Да 25-годдзя ГДУ. Расказваем аб выпускніках універсітэта.

● 6 Старонкі гісторыі. Да чарговай гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі.

# Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны

## аб'яўляе прыём студэнтаў на I курс завочнага факультэта на 1994-95 навучальны год

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

**Залічэнне ва універсітэт** праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных конкурсных экзаменах у наступнай паслядоўнасці:

-- абітурыенты, вызваленыя ад уступных экзаменаў;

-- абітурыенты, якія карыстаюцца правам пазаконкурснага залічэння;

-- медалісты, выдатнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ на базе няпоўнай сярэдняй школы, а таксама выпускнікі ПТВ на базе сярэдняй школы з дыпломам з адзнакай і паступаючыя на спецыяльнасці, адпавядаючыя атрыманым прафесіям, якія здалі прафілюючы экзамен на адзнаку "5";

-- астатнія абітурыенты.

Асобы, якія закончылі падрыхтоўчае аддзяленне, залічваюцца ў адпаведнасці з палажэннем аб ім.

Колькасць выдзеленых мэтавых месц вызначаецца прыёмнай камісіяй да пачатку ўступных экзаменаў.

**Пры роўнасці конкурсных балаў** перавагай карыстаюцца:

-- асобы, якія маюць дагаворы на падрыхтоўку спецыялістаў;

-- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.арт. 19,20,23,24,25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС", інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

-- асобы, якія працуюць па профілю выбранай спецыяльнасці больш аднаго года;

-- выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ, якія паступаюць на роднасныя спецыяльнасці, са стажам менш аднаго года.

**Па-за конкурсам** пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменаў залічваюцца:

-- воіны-інтэрнацыяналісты;

-- дзеці інвалідаў вайны і загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў;

-- круглыя сіраты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў;

-- інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;

-- асобы, які маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС".

Паступаючыя ва універсітэт **падаюць наступныя дакументы:**

-- заяву на імя рэктара па адзінай форме;

-- дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале;

-- шэсць фотакартак /без галаўнога ўбору/ памерам 3х4 см;

-- медыцынскую даведку па форме 086у /паступаючыя на спецыяльнасць "фізічная культура і спорт" дадаткова праходзяць медыцынскі агляд у Гомельскім абласным фізкультурным дыспансеры/;

-- выпіску з працоўнай кніжкі;

-- дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання льготамі, дагаворы і інш.;

-- пашпарт прад'яўляецца ў прыёмную камісію па прыбыццю ва універсітэт.

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны, корпус №1, прыёмная камісія. Тэл. для даведак: 57-11-15.

Яўка на ўступныя экзамены па выкліку універсітэта.

ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.

---

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.Скарыны**

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:*

-- гісторыі Беларусі -- асістэнта;

-- эканомікі і сацыялогіі працы - асістэнта;

-- геафізікі -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней аднаго месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

РЭКТАРАТ.

---

# *ПРОБУЖДЕНИЕ*

Любовь Мезина



*Ах, март, какие перемены:*
*То снег, то дождь,*
*то звук капели*
*Веселой нотой извещает,*
*Что скоро вовсе снег растает, --*
*Ковров зимы седой творец,*
*И стуж не будет, наконец.*
*Теплее солнце пригревает,*
*На льдинках, радуясь, играет,*
*И звон синиц, волнуя, тает*
*В дали прозрачно-голубой...*
*С весной, друзья мои!*
*С весной!*

---

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці пасля цяжкай працяглай хваробы дацэнта кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства **ЧАЙКУНА** Паўла Міхайлавіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

---

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе IВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 131.
Падпісана да друку 17.03.94.